План правядзення тэматычнага дня ў дзяржаўнай установе адукацыі «Санаторны дзіцячы сад №6 г.Рагачова» «Дзень роднай мовы» - 21 лютага 2023г

**Мэта:**

- Фарміраваць уяўленне аб сабе як частцы грамадства, аб носьбітах яго культуры, фарміраваць пачуццё нацыянальнай самасвядомасці;
- Знаёміць дзяцей з вуснай народнай творчасцю, культурнымі традыцыямі беларускага народа;
- Выхоўваць гонар за сваю краіну, любоў да Радзімы, гонар за нацыянальную прыналежнасць, за багацце сваёй нацыянальнай культуры.

| № п/п | Назва мерапрыемства | Удзельнікі | Адказныя |
|---|---|---|---|
| 1. | Складанне запрашэння “Прыязджайце ў Беларусь” | Выхаванцы старэйшага дашкольнага ўзросту | Выхавальнікі |
| 2. | Дыдактычныя гульні “Складзі макет Беларусі”, “Знатакі свайго горада” | Выхаванцы старэйшага дашкольнага ўзросту | Выхавальнікі |
| 3. | Занятак “Як гучыць наша родная мова…” | Выхаванцы сярэдняга дашкольнага ўзросту | Выхавальнікі |
| 4. | Гутарка “Дзяржаўныя сімвалы Беларусі”, “Мой край завецца Беларуссю” | Выхаванцы сярэдняга дашкольнага ўзросту | Выхавальнікі |
| 5. | Крыжаванка «Сімвалы Рэспублікі Беларусь» | Выхаванцы старэйшага дашкольнага ўзросту | Выхавальнікі |
| 6. | Моўная гульня «Прывітанне», «Паўтары за мной», «Што гэта?» | Выхаванцы малодшага дашкольнага ўзросту | Выхавальнікі |
| 7. | Вечар загадак “Жывёлы і птушкі роднага края” | Выхаванцы сярэдняга і старэйшага дашкольнага ўзросту | Выхавальнікі |
| 8. | Чытанне твораў мастацкай літаратуры пра Радзіму | Выхаванцы дашкольнага ўзросту | Выхавальнікі |
| 9. | Гульня-драматызацыя па беларускай народнай казцы “Коцік, пеўнік і лісіца” | Выхаванцы малодшага дашкольнага ўзросту | Выхавальнікі |
| 10. | Размова “Прывітанне па-беларуску” | Выхаванцы ранняга ўзросту | Выхавальнікі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 11. | Дыдактычная гульня “Будзь ветлівым” | Выхаванцы ранняга ўзросту | Выхавальнікі |
| 12. | Мастацкая дзейнасць “Наш горад” | Выхаванцы сярэдняга і старэйшага дашкольнага ўзросту | Выхавальнікі |
| 13. | Расказванне беларускай народная казкі «Рукавічка» | Выхаванцы ранняга ўзросту | Выхавальнікі |
| 14. | Віктарына «Беларусь-наш родны край» | Выхаванцы старэйшага Дашкольнага ўзросту | Выхавальнікі |
| 15. | Беларуская народная рухомая гульня “Заінька” | Выхаванцы ранняга ўзросту | Выхавальнікі |
| 16. | Фізкультурная забава для «Вясёлыя гульні дзяцей беларусаў» | Выхаванцы малодшага і сярэдняга дашкольнага ўзросту | Кіраўнік фізічнага выхаван-ня |
| 17. | Музычны канцэрт «Даражыць пявучым гукам родным» | Выхаванцы дашкольнага ўзросту | Музычны кіраўнік |
| 18. | Выстава вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі. | Выхаванцы дашкольный установы | Намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці |
| 19. | Экскурсія ў музей народнай славы на выставу “Беларуская хатка” | Выхаванцы старэйшага дашкольнага ўзросту | Выхавальнікі старшай групы |
| 20. | Гульня-конкурс для выхаванцаў старэйшага дашкольнага ўзросту і іх бацькоў«Быць зямлі сваёй сынам…» | Выхаванцы старэйшага дашкольнага ўзросту і бацькі | Выхавальнікі старшай групы |

**«БЫЦЬ ЗЯМЛІ СВАЁЙ СЫНАМ…»
ГУЛЬНЯ-КОНКУРС ДЛЯ ВЫХАВАНЦАЎ
СТАРЭЙШАГА ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ І ІХ БАЦЬКОЎ**

**Месца правядзення:** Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Дзіцячы сад № 6 г. Рагачова”
**Мэта:** папулярызацыя беларускай мовы сярод бацькоў і выхаванцаў установы дашкольнай адукацыі.
**Задачы:** праз сумеснае спаборніцтва бацькоў і дзяцей садзейнічаць фарміраванню грамадзянска-патрыятычных якасцяў сродкамі роднай мовы; развіваць памяць, уважлівасць, хуткасць рэакцыі, уменне паслядоўна выказваць свае думкі; выхоўваць сяброўскія ўзаемаадносіны, культуру паводзін.
**Матэрыял і абсталяванне:** сцяг горада Рагачова, эмблемы для каманд «Дняпро» і «Друць», карта Рагачоўскага раёна, матэрыял да гульні «Складзі герб горада».
**Папярэдняя праца**: завучванне вершаў аб Рагачове, беларускіх прыказак, прымавак, гутаркі аб родным горадзе, краіне, экскурсіі.
**Удзельнікі:** выхаванцы 5-6 гадоў і іх бацькі.
**Дзеючыя асобы:** вядучы і гледачы.

**Ход мерапрыемства**

Зала святочна ўпрыгожана. У мерапрыемстве прымаюць удзел 2 каманды: “Дняпро” і “Друць” ( у кожнай камандзе па 5 дзяцей і 5 бацькоў). Журы сочыць за ходам гульні, дае адзнаку на адказы бацькоў і дзяцей (фішкі).

Гучыць песня “Куточак зямлі” (муз. і сл. Я.Жабко) (фанаграма)

**Вядучы.** Пачаць нашу сустрэчу хочацца са слоў Я. Коласа:

О, край родны, край прыгожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей у свеце божым
Гэтых светлых берагоў,
Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,
Дзе бары, лясы гудуць.
Дзе мядамі пахнуць грэчкі,
Нівы гутаркі вядуць.

Ці можна забыць свой родны кут, сваю маленькую радзіму, дзе ты нарадзіўся і вырас. А ці ведаеце вы сваю малую радзіму, свой горад? Наша гульня-конкурс прысвечана роднаму кутку, прыгожаму, зялёнаму і чыстаму гораду Рагачову.

*(Вядучы прадстаўляе каманды, членаў журы).*

**Вядучы.** Хто з удзельнікаў можа адказаць, чаму вы выбралі такія назвы каманд?

(Таму што наш горад знаходзіцца паміж дзвюма рэкамі Дняпро і Друць).

1. ***Гульня “Перакладчыкі” (для дзяцей).***

*Вядучы называе словы на рускай мове, а дзеці адказваюць на беларускай мове.*

*Словы называюцца па чарзе кожнай камандзе, калі каманда не можа адказаць, права адказа перадаецца другой камандзе.*

Дедушка – дзядуля; бабушка – бабуля; кукла – лялька; петух – певень; девочка – дзяўчынка; мальчик – хлопчык; белка – вавёрка; цветы – кветкі; туча – хмара; игрушка – цацка; кровать – ложак; ковер – дыван; друг – сябар игра – гульня.

*(Пасля першага конкурсу журы падводзіць вынікі).*

2. ***Конкурс юных чытальнікаў (дзеці расказваюць вершы пра горад Рагачоў).***

**Вядучы.** Наш горад вельмі прыгожы. Гэта заўважаем не толькі мы, але і нашы шматлікія госці. Паэты-землякі прысвячаюць нашаму гораду шмат вершаў. Зараз мы паслухаем некаторыя з іх, а журы ацэніць выступленне дзяцей.

Я Рагачоў вітаю,
Прыгожай вясенняй песняй
Няхай ён у родным краі
Квітнее парой вясенняй.
Няхай ён для шчасця і міру
Працу сваю прыносіць.
Штодзённа ласкава і шчыра
У госці сяброў сваіх просіць.

В. Клімянкоў

Сын Дняпра і Друці
Сціплы наш Рагачоў
Незабыць мне ў жыцці
Мілых тых берагоў.
Расцвітаюць сады
І акацыяў рад –
Хай так будзе заўжды
Шмат стагоддзяў падрад.

В. Сотнікава

*(Пасля конкурсу журы падводзіць вынікі).*

3. ***Прыказкі і прымаўкі пра родныя мясціны.***

**Вядучы.** (*Каманды па чарзе называюць прыказкі і прымаўкі. Калі адна з каманд замешкалася, чарга пераходзіць да другой каманды).*

Прыклады:
Родная зямелька, як зморанаму пасцелька.
Свая хатка – родная матка.
Чыя краіна, таго і мова.
Свой сухар смачней чужых пірагоў.
Кожнаму свая Радзіма самая лепшая.
У родным лесе і куст родны.
Да ўсякай птушачкі, сваё гняздо міла.
Чужая старана пірагамі не накорміць.

*(Пасля конкурсу журы падводзіць вынікі).*

4. ***Віктарына «Сцяг горада Рагачова»***

**Вядучы**. А зараз звярніце ўвагу на сцяг горада Рагачова. На ім мы бачым рог, які размешчаны на трох палосах рознага колеру.

*Пытанні да дзяцей:*

1. Што азначае паласа зялёнага колеру?

(Сам горад вельмі зялёны ад насаджэнняў і вакол яго шмат лясоў)

2. Што адзначае дзве паласы сіняга колеру?

(праз Рагачоў працякаюць дзве ракі Дняпро і Друць).

*Пытанні для бацькоў:*

1. Чаму сцяг нашага горада жоўтага колеру?

(У далёкія часы рагачоўшчына славілася пчалаводствам)

2. Чаму герб і сцяг Рагачова упрыгожвае рог?

(Ад дрэўне-польскага слова “рох” – лес, ад дрэўне-літоўскага “рогос” – святое месца, ад славянскага імя “Рог” – Рогач, у рагу дзвюх рэчак)

*(Пасля конкурсу журы падводзіць вынікі).*

5. ***Дыдактычная гульня «Складзі герб нашага горада?»***

**1 Вядучы.** Прапануе камандам на хуткасць скласці герб горада з шасці частак. *(Журы падводзіць вынікі).*

6. ***Скорагаворка пра Рагачоў***.

**Вядучы.** Адзін з бацькоў ад кожнай каманды па чарзе прагаворвае скорагаворку.

Рагатун Рыгорка родам
З Рагачова горада
Як захоча - зарагоча
Рагатлівым рогатам.

Э.Агняцвет

*(Журы падводзіць вынікі).*

7. ***Складзі карту Рагачоўскага раёна***.

**Вядучы.** (Выконваюць бацькі, па двое ад каманды. Карта разрэзана на 9 частак. Гучыць беларуская музыка, дзеці могуць дапамагаць бацькам).

*(Журы падводзіць вынікі).*

8. ***Адкажы правільна і хутка***. Каманды па чарзе адказваюць на пытанні. Вядучыя задаюць пытанні камандам па чарзе.

*(У гэты час дзеці рыхтуюцца да драматызацыі казкі “Муха-пяюха”)*

1. Як называецца месца, дзе абжываліся першыя пасяленцы Рагачова? (Замкавая гара)
2. Назавіце год заснавання Рагачова? (1142 год)
3. Назавіце імя каралевы, якая на Замкавай гары пабудавала замак? (Каралева Бона)
4. Які населены пункт нашага раёна ўпамінаецца ў летапісе раней, чым Рагачоў? (вёска Лучын)
5. Якія цары праязджалі праз Рагачоў? (Кацярына II, Мікалай I, Аляксандр I)
6. Што было тысячу год таму назад на беразе ракі Друць у раёне вёскі Задруцце? (Крэпасць)
7. Ці былі ў Рагачове свае грошы? (Былі ў 1918 годзе: 1,5,10 рублёў)

8.Як раней называлася возера Добрае, што каля вёскі Ходасавічы? (Святое)
9.Назавіце імя першага мецэната г. Рагачова, у гонар якога называецца прэмія? (Васіль Васільевіч Іолшын, іолшынская прэмія)
10.Чаму рагачоўцы ганарацца пісьменнікамі: Макаёнкам, Галкіным, Сурначовым? (Гэта нашы землякі)
11.Чым праславіўся Рагачоў на ўвесь Савецкі саюз у 1940 годзе? (Быў ініцыятарам руху за чысціню і азеляненне горада)
12.Колькі зараз жыхароў пражывае ў горадзе? (Каля 40 тыс.)
13.Які будынак зараз знаходзіцца на рэстаўрацыі? (Касцёл Святога Антонія)
14.У імя каго жыхары Рагачова стварылі Курган Славы? (У імя загінуўшых і жывых, 1967 год.)
15.Ці ёсць у нас вуліцы, якія носяць імёны рагачоўцаў? (Сурначова, Галкіна, Казлоўскага, Сцяпанава, Калеснікава…)
16.Чаму адна з вуліц носіць імя Сцяпанава? (Сцяпанаў наш зямляк, міліцыянер, які загінуў пры выкананні сваіх абавязкаў)
17.Калі быў вызвалены Рагачоў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў? (З 23 на 24 лютага 1944 года)
18.Назавіце прозвішча алімпійскага чэмпіёна, пачэснага грамадзяніна горада Рагачова? (Мікалай Гарбачоў)
19.У імя каго пабудаваны помнік каля цэнтральных варот МКК? (У імя вызвалення Рагачова ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў)
20.Чаму адна з вуліц носіць імя Казлоўскага? (Казлоўскі быў міністрам геалогіі СССР)
21.На што падобны Рагачоў, калі на яго глядзець зверху? (На рог)
22.Якую ваду вырабляе санаторый "Прыдняпроўскі"? ("Рагачоўская")
23. Немізанскі, Арэстаў, Паўлаў …- гэта сучасныя… (Паэты Рагачова)
24.Назавіце прозвішчы знакамітых мастакоў Рагачова? (Маліноўскі, Лемяшкоў, Хахлоў…)
25. Што было раней ў будынку цэнтральнай бібліятэкі? (Земская ўправа)

*( Журы падводзіць вынік, падлічвае агульную колькасць балаў праз фішкі).*

**Вядучы**. А зараз вашай увазе прадстаўляецца беларуская народная казка "Муха-пяюха" ( драматызацыя казкі дзецьмі).

Вялікі дзякуй, паважаныя бацькі і дзеці, за цікавую сустрэчу. Сёння мы ўсе разам размаўлялі на беларускай мове, нашай прыгожай, меладычнай, роднай мове. Успомнілі гісторыю нашага горада і, менавіта, пачулі шмат новага. Мы спадзяёмся, паважаныя бацькі, што і далей вы будзеце выхоўваць у сваіх дзяцей цікавасць да гісторыі нашага горада, жаданне размаўляць на роднай мове.

**Спіс выкарыстанай літаратуры.**

1.Дубініна, Д.М. Выхаванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасці да беларускай мастацкай літаратуры і фальклору: дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі / Д.М. Дубініна. – Мінск : Новое знание, 2016. – 208 с.

2."Мой родны кут…". Зборнік метадычных матэрыялаў па патрыятычным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту: у 2 ч. Ч.1, 2 / слад. В.В.Мініна. – Мазыр: ТАА ВД "Белы Вецер", 2007

3.Калачова І.І. Ад добрага кораня – добры парастак: этнапедагагічныя традыцыі беларусаў у выхаванні дзяцей: дапам. для педагогаў дашк. устаноў / І.І. Калачова .– Мн.: НМЦэнтр, 1999.-128с.